Круковіч, Н. Светлая школьная казка / Н. Круковіч // Родныя вытокі. – 2024. – 9 сак. – С. 4.

**Светлая школьная казка**

*ЯК КРУЛЕЎШЧЫНСКАЯ СШ ІМЯ І. П. ЦІТКОВА АДЗНАЧЫЛА СВАЁ 50-ГОДДЗЕ*

**«Школа – гэта казка без канца» – так называлася праграма, прымеркаваная да 50-гадовага юбілею Крулеўшчынскай сярэдняй школы імя І. П. Ціткова. Урачыстасць адбылася ў школьнай актавай зале.**

На свяце прысутнічалі старшыня раённага Савета дэпутатаў Валянціна Рандарэвіч, намеснікі старшыні райвыканкама Аксана Палачаніна і Сяргей Карчэўскі, начальнік аддзела па адукацыі райвыканкама Дзмітрый Парцянка, старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Таццяна Ягорава, старшыня Крулеўшчынскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр Іванькович, а таксама ветэраны педагагічнай працы школы, кіраўнікі ўстаноў адукацыі раёна, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі Крулеўшчынскага сельсавета.

– Хочацца не толькі павіншаваць школу з залатым юбілеем, але і выказаць шчырыя словы ўдзячнасці работнікам, у тым ліку ветэранам, за працу, – сказала ў сваім прывітальным выступленні Валянціна Рандарэвіч. – Хтосьці параўноўвае школу з маленькай краінай, хтосьці з дарогай, домам, вялікай сям'ёй. Але якія б ні былі параўнанні, відавочна, што школа іграе значную ролю ў лёсе кожнага чалавека. Бо яна не проста вучыць чытаць і пісаць, гісторыі, геаграфіі ці літаратуры, але і важным жыццёвым прынцыпам, думаць, прымаць верны выбар, радавацца і суперажываць, правільна ставіць мэты і дасягаць іх, сябраваць і любіць. Галоўнае, каб чалавек успамінаў сваіх настаўнікаў з удзячнасцю, бо яны гэтага заслугоўваюць.

Валянціна Юр'еўна пажадала віноўнікам урачыстасці поспехаў, радасці за сваіх вучняў, светлых дзён і прыемных сустрэч. Уручыла ўзнагароды і сертыфікат ад райвыканкама і райсавета дэпутатаў на набыццё агароднінарэзкі ў школьны харчаблок.



**Валянціна Рандарэвіч уручыла Уладзіміру Піскунову сертыфікат на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы школы.**

Ганаровымі граматамі райвыканкама ўзнагароджаны калектыў школы і намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Людміла Крыльцова. Падзяку старшыні раённага Савета дэпутатаў атрымала настаўнік пачатковых класаў Святлана Цішаловіч.

Шэраг работнікаў удастоены грамат аддзела па адукацыі райвыканкама, грамат райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, падзяк дырэктара школы.

Школе перададзены падарункавыя сертыфікаты ад аддзела па адукацыі – на набыццё спартыўнага інвентару, ад аддзела па спорце і турызме – на 50 наведванняў басейна, ад кіраўнікоў устаноў адукацыі раёна і прадпрыемстваў арганізацый, размешчаных у Крулеўшчынскім сельсавеце.

Цудоўныя музычныя падарункі падрыхтавалі ветэраны педагагічнай працы і кіраўнікі ўстаноў адукацыі раёна. Першыя адрасавалі песню, напісаную вядомай паэткай Докшыччыны, былым намеснікам дырэктара Крулеўшчынскай школы Марыяй Януш, другія выканалі папулярную дзіцячую песеньку. Педагогі чыталі вершы, жартавалі, крэатывілі – бясспрэчна, іх віншаванні запомняцца гледачам надоўга.

Не менш захапляльнымі былі музычныя выступленні дырэктара школы Уладзіміра Піскуновіча, настаўніцы Алесі Паляковай – адной з самых любімых у раёне спявачак, вакальнай групы педагогаў. Вучні падрыхтавалі да юбілею песні, танцы і сцэнкі.



**Аксана Палачаніна (злева) узнагароджвае Людмілу Крыльцову.**

Падчас мерапрыемства былі прадэманстраваны відэавіншаванні, якія даслалі знакамітыя крулеўшчынскія выпускнікі.

А фішкай вечара стала запальванне сямі сімвалічных свечак. Свечку Дзяцінства запалілі першакласнікі. Свечку Мудрасці – ветэраны педагагічнай працы. Свечку Памяці – былы дырэктар школы Галіна Белая, якая ўзначальвала ўстанову трынаццаць гадоў. Свечку Юнацтва – будучыя сёлетнія выпускнікі. Свечку Надзеі – маладыя педагогі Марына Бляева і Павел Зайцаў. Свечку Дружбы – выпускнікі мінулых гадоў, а зараз бацькі вучняў школы: намеснік старшыні ранвыканкама Сяргей Карчэўскі і намеснік дырэктара КУП «Докшыцкі» Святлана Плыгаўка. Свечку Веры – дырэктар школы Уладзімір Піскуновіч. Гэта цырымонія надала асаблівай цеплыні ўсяму святу. А насамрэч школа і ёсць ачаг, які саграе сваіх вучняў на працягу ўсяго іх далейшага жыцця. Бясконцая светлая казка.

**P.S.** *Восем нашых відэаролікаў з мерапрыемства ў Крулеўшчынскай СШ, размешчаных у праекце «Беларусы МЫ!» у TikTok, набралі ўжо каля 900 тысяч праглядаў.*



**Выступленне ветэранаў педагагічнай працы.**



**Атмасфера свята была душэўнай.**

**З гісторыі**

Школа ў Крулеўшчыне з'явілася, як мяркуецца, у 1921–1922 гадах і існавала да вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. Спачатку па асобных успамінах, заняткі праводзіліся ў прыватных дамах. У 1937 годзе пабудавалі двухпавярховы цагляны будынак для сямігадовай школы імя Пілсудскага. У гады Вялікай Айчыннай вайны там размясціўся нямецкі гарнізон. А ў 1943-м будынак быў разбураны.

У 1954 годзе пабудавалі двухпавярховую Круляўшчызненскую сярэднюю школу № 36 Калінінскай чыгункі. Праз некалькі гадоў яна была перададзена ў распараджэнне Беларускай чыгункі і атрымала ўжо № 57. У 1962 годзе – у распараджэнне Міністэрства адукацыі СССР.

1 верасня 1973 года адкрыты новы трохпавярховы будынак Круляўшчызненскай сярэдняй школы, які функцыянуе да гэтага дня. У той дзень школьны парог пераступілі 998 вучняў. Першым дырэктарам установы стаў Яўген Герасімавіч Малчанаў які ўзначальваў яе 20 гадоў.

21 лістапада 2008 года Круляўшчызненская школа перайменавана ў Крулеўшчынскую. 11 ліпеня 2022 года ёй прысвоена імя Героя Савецкага Саюза І. П. Ціткова.

Праектная ўмяшчальнасць Крулеўшчынскай СШ – 640 вучняў. Зараз тут навучаюцца 212 дзяцей, працуюць 52 работнікі, зі іх 32 педагогі.

**Ніна КРУКОВІЧ.**
Фота аўтара.